10 сентября, четверг 1998 г.
N29
Приложение - программа ТВ.
Цена - 4000 руб.

Биржа информации

Цитата недели

Королями не рождаются, ими становятся вследствие всеобщего заблуждения.

Бернард Шоу

до окончания полномочий президента согласно Конституции 1994 г.

осталось 313 дней

В Индуре не знают, что Лукашенко продлил себе полномочия

Разразившийся в России политический и экономический кризис уже не постепенно, а методом замедленных взрывов наступает и на Беларусь.

Прежде всего в нашей стране на это явление отреагировали цены. На прошлой неделе цены на импортные товары поднялись почти на треть. Ежедневно в погоню за более дешевыми продуктами вступает все большее и большее количество граждан. Очереди на рынках и магазинах в Гродно тому свидетельство. Сахар одно время предлагали только мешками, правда, в выходные дни можно было приобрести и килограммами, но уже по 45 тысяч рублей. "Метут" муку, гречку, крупы, макароны и прочее пшено. Народ копает картофель, собирает грибы - в общем, в выходные город как бы вымирает.

Скучновато на экране телевизора выглядит наш президент. Мрачноват, без бодрой улыбки, правда, по-прежнему, поддерживает вид уверенного в себе человека. На прошлой неделе довелось проезжать по границе Свислочского и Волковысского районов. Стоит неубранный ячмень, почерневший с осыпавшимся колосом. Причем, на очень больших участках. Такого не припомнят даже старики. А ведь уже пора на этом месте сеять озимые. Люди в деревне, хотя и в растерянности, но все же продолжают трудиться, понимая, что если сами не смогут себя обеспечить на зиму, то никакая власть им в этом не поможет.

Кстати, о власти говорят суровые слова. Особенно довелось наслушаться в Индуре, недалеко от Гродно. Кто бы мог подумать, как невзлюбили здесь нашего президента. Те слова, которые я слышал в его адрес, причем, от пенсионеров, не пристало даже повторять в газете. Люди безапелляционно утверждали, что на следующий год, они за него голосовать не станут, чтобы он теперь не обещал. Я было удивился, что в Индуре ждут в следующем году выборов, пояснив гражданам, что после референдума 1996 года полномочия президента продлены до 2001 года. Никто не хотел верить, говорят, тогда об этом ничего не сказали, неужели обманул... А еще пенсионеры из Индуры объясняли, что политика нашего президента это полнейший поворот к большевистской власти: людям опять не дают возможности жить, зажимают, принуждают, отбирают, хотят всех сделать зависимыми. А они в свою очередь, как аргумент, показывают пальцем в сторону западного соседа: смотри, мол, мы помним как трудно у них было и как быстро при умном руководстве они смогли выбраться из этого.

Что и сказать на это? Помните, древнюю китайскую мудрость: дай вам Бог жить в интересные времена. Вот и живем. Но только, кто этого желал...

М.КАРНЕВИЧ

100 ТЕЛЕФОННЫХ ЗВОНКОВ ГРОДНЕНЦАМ

"Надо создавать запасы..."

Паникеры-россияне, отвыкшие от финансовых катаклизмов, при последнем обвале "ихнего" рубля бросились скупать товар из магазинов. Большинство белорусов, для которых экономические кризисы дело такое же привычное, как дожди по осени, отнеслись к цепному заячьему обвалу философски: это надо пережить, не расходуя драгоценную мышечную энергию на напрасные метания. Впрочем, такое спокойствие возбудило подозрение, что народ верит больше заявлениям о "многовекторности" белорусской экономики, а не своим "бесстыжим глазам".

Отразился ли российский финансовый кризис на состоянии белорусской экономики? - спросили мы у сотни гродненцев в нашем традиционном телефонном опросе.

Не отразился - 23%

"Я вообще не могу сказать, потому что я недавно приехал."


"Мне трудно судить, я не связан с этим" - примерно такими были ответы большей половины наших собеседников этой группы.

Некоторые считают, что экономические проблемы государства не коснутся их семьи, но этому есть объяснения:

"На моей семье - никак не отразится. Я не работаю сейчас, я ухаживаю за больной матерью. А когда работала, то на полставки и зарплата у меня была 650 тысяч - так что на мне это никак не отразится"

Отразился - 77%

Судя по ответам респондентов этой группы, народ, как всегда, оценивает родную экономику по



собственному благосотоянию:

"Доллар поднялся, а денег у народа нет. Я частный предприниматель и ничего не покупаю, потому что доллар большой."

"Отразилось, и не только на Беларуси. На нашей семье, как и на других тоже отразится: цены увеличиваются, естественно, продуктов меньше приходится покупать."

"Я пошла на рынок: и масло дорогое, и сахар. Сахар 45 тысяч за килограмм, а недавно еще 27 стоил. Очень тяжело это отражается на нас. А ведь мы живем я не считаю, что бедно. Средне. Но есть люди, что еще бедней живут, им еще тяжелее."

"Безусловно, отразился: российский кризис добавил скорости нашему неконтролируемому курсу доллара. Но вот, что мне делать с российскими деньгами, которые остались - совершенно непонятно."

Однако, обострившуюся запасливость россиян и наших сограждан все наши собеседники дружно осудили:

"Я сегодня ехала в троллейбусе - все с огромными сумками. Я считаю, что это неправильно, что это - паника. Свой желудок мы навечно не наполним."

"Я готовлюсь к кризису: у меня дача есть, я могу запастись. Надо создавать запасы. Но скупать все не нужно. Я когда-то запасла соль, так ее столько было - хоть продавай. Так что, я считаю что это излишне: появится сахар, будут работать заводы. Я считаю, что наш президент и правительство примут меры, чтобы мы жили лучше!"

И.ПЫТАВКА

8 верасня - Дзень вайсковай славы.
Свята ўдалося



Нарэшце ў Гродна па-сапраўднаму было адзначана адно з важнейшых гістарычных святаў беларусаў - 8 верасня, Дзень вайсковай славы. Яно адбылося ў мінулы аўторак каля старадаўняй Каложы, на тым месцы, дзе стаіць памятны знак Пагоня на Грунвальд, дзе сотні гадоў таму благаслаўлялі воінаў, якія ішлі абараняць нашу Радзіму ад захопнікаў. У святе бралі ўдзел некалькі тысяч гродзенцаў.

На жаль, шмат якія нацыянальныя святы ў нашай краіне ніяк не адзначаюцца, наадварот нам прапаноўваюць чужое, бальшавіцкае, да чаго ні наш народ, ні гісторыя ніякіх адносінаў не мелі і не маюць. Гэтым разам упершыню ў Гродне сабралася столькі людзей, каб ушанаваць памяць менавіта сваіх продкаў. Як зазначыў адзін з выступоўцаў, дзякуючы гэтай бітве пад Оршай мы сёння можам ганарыцца сваёй культурай і называцца беларусамі. Тады, 8 верасня 1514 года, 80-тысячнае маскоўскае войска было спынена і разбіта 30 тысячным войскам нашай дзяржавы пад кіраўніцтвам Канстанціна Астрожскага. Гэтай перамогай заўсёды захапляюцца гісторыкі і іншыя дасведчаныя людзі, а ў гэтым годзе аб ёй, нарэшце, даведаліся некалькі тысяч гродзенцаў.

Дарэчы, свята было добра падрыхтавана Беларускім Народным Фронтам і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамадой. Гродзенцы змаглі пераканацца, што і ў нас ёсць выдатныя спевакі-барды Андрэй Мельнікаў з Оршы, Зміцер Бартосік з Вільні. Праўда, найбольш усім спадабалася выступленне Віктара Шалкевіча з новымі песнямі. Упершыню мы маглі даведацца, што мінскія студэнты гістфака маюць свой рыцарскі клуб "Калюмна". Яны прыехалі на свята ў даспехах і паказалі гледачам сапраўдныя сярэднявечныя паядынкі.

Аказваецца нашы людзі могуць радавацца жыццю і без прымусу, і без гарэлкі. Трэба было пабачыць як маладыя прыгожыя дзяўчаты скакалі на муры каля Каложы з бела-чырвона-белымі сцягамі, публіка апладзіравала. Дарэчы, да справы добра ўпісаліся нейкія камерсанты, прапаноўваючы паслугу: пакатацца вярхом на кані. Да іх таксама стаяла чарга.

Свята сапраўды ўдалося. І што цікава, адпачатку не было міліцыянтаў, і нават, калі некалькі з іх усё ж потым падыйшлі, то працы для іх усё роўна не было. Дарэчы, арганізатары аб'явілі, што наступным разам запрашаюць усіх прысутных на "Дзяды", якія адзначаюцца ў нашай краіне 2 лістапада.

М.КАРНЕВІЧ

террористы в городе

Заложники в Доме связи

Террорист, захвативший в прошлую среду троих девушек-операторов переговорного пункта Дома связи требовал вызвать к нему дежурного КГБ.

В 18.25 42-летний гродненец ворвался в операторскую угрожая взрывным устройством.

Операторы нажали на кнопку тревоги. В задержании террориста участвовали сотрудники Ленинского РОВД, внутренних войск, отделения "Охрана", ГАИ. Территория вокруг Дома связи была оцеплена, персонал эвакуирован, общественный транспорт пущен обходными путями. Для переговоров была доставлена мать террориста. В 19.10 прибыл сотрудник КГБ, которому преступник отдал муляж (пакет с гантелей) и сдался. Никто не пострадал.

Рассказывает жертва террориста, 28-летняя девушка-оператор не пожелавшая назваться:

- Получилось, что дверь в операторскую мы не успели закрыть: вышла девушка, отвлекли клиенты моментально - и он в эту секунду ворвался. У нас ключи всегда в двери торчали, закрыл дверь и.... кошмар что было... сказал, чтобы мы спокойно работали и вызвали КГБ. Это страх был: он белый такой, весь в поту!

Мы начали набирать, но кто сейчас номер кэгэбэшников дает... Там какие-то давали, он пробовал разговаривать, орал так на них... Пришлось по сигнализации милиционеров вызвать. Они поняли, что это не шуточки и стали людей из кабинок выгонять. Но как всегда у нас люди: цирк бесплатный, никто не уходит, собираются еще звонить. Ну, а потом начали милиционеры подъезжать, стали с ним разговаривать.

Это где-то полтора часа длилось, пока мы с ним сидели, песни пели...Кошмар что было! Он начал кричать, что у него бомба и он всех взорвет и на тот свет пойдет с тремя женами! Мы пережили ужас! Он посадил нас в окружении себя, одну девочку заставил вторую дверь держать, потому что мы ему ключи не отдали.. Он сказал, что если кто-то зайдет из этой двери, он взорвет... Он посадил нас вокруг и сказал, что если снайпер будет стрелять, то попадет в нас, а не в него... Тут крика было! Привозили его мать, он так сильно кричал на мать!

(окончание на стр. 3)

Г Р О Д Н А

КАЛГАС ВЫКУПІЎ ПЯТУЮ КРАМУ

Днямі на вуліцы Дамброўскага адчынілася прадуктовая крама "Вікторыя". Яшчэ год таму тут распачалі рамонт, які ніяк не маглі скончыць. Месяц таму магазін выкупіў калгас "Кастрычнік" і рамонт быў хутка закончаны. "Кастрычнік", дарэчы, не проста калгас, а сельскагаспадарчае кааператыўнае прадпрыемства. Акрамя "Вікторыі" ён мае яшчэ чатыры крамы: у мікрараёне "Вішнявец", на вуліцы Соламавай, каля аўтакалоны і на вуліцы Свярдлова.

"Виктория"-- значит "победа",-- патлумачыў мне дырэктар. Мне міжволі ўспомнілася "битва за урожай". Не інакш, у гонар перамогі ў гэтай бітве і назвалі краму.

На адкрыццё прыйшло шмат людзей. Чэргі сабраліся такія, што нават не было відно вітрынаў, асабліва ў мясным аддзеле. Прадавалі недарагія вантробкі і свіныя галёнкі. Але калі я зазірнула ў вітрыну, дык убачыла там дзве свіныя галавы. Ну проста як у старыя савецкія часы! Між іншым, я даведалася, што чаргу тут займаюць з сямі гадзінаў раніцы, бабулькі прыходзяць нават з лавачкамі.

Гэтая крама сапраўды была неабходная. Бо жыхарам Дамброўскага даводзілася хадзіць ва ўніверсам, што знаходзіцца на бульвары Ленінскага Камсамола. Таму на працягу года чэргі тут былі амаль удвая даўжэйшыя.

На вуліцы Дамброўскага, якая мае працягласць 1300 метраў, акрамя новай крамы, ёсць таксама прадуктовая, гароднінная і бакалейная. Апошнюю некалькі гадоў назад выкупілі на аўкцыёне, але цяпер яна ізноў дзяржаўная. Відаць, справы ў прыватных прадпрымальнікаў ішлі не надта добра.

Акрамя гэтага, каля аўтастаянкі ў самым канцы вуліцы існуе яшчэ крама, дзе прадаюць віно, напоі і шакалад. Яна таксама доўгі час пераходзіла "з рук у рукі". Раней яна належала вядомай мінскай фірме "PUSHE", кіраўнік якой атрымаў палітычны прытулак у Польшчы. "PUSHE"-- распушылася",--пажартавала прадаўшчыца.

ТЭРЭСА БАЗЫЛЕВІЧ.

Амаль усе ліцэісты сталі студэнтамі

Напачатку навучальнага года ў гродзенскім ліцэі №1 падвялі вынікі здачы ўступных экзаменаў у ВНУ сёлетнімі выпускнікамі. Аказваецца, болей за 80% былых ліцэістаў сталі студэнтамі. А скончылі яго сёлета каля 180 вучняў.

Паступілі ва ўніверсітэты і інстытуты ўсе 23 выпускнікі эканамічнага класа, які закончыла таксама і я. Гэта, між іншым, рэкорд ліцэя. Нашым класным кіраўніком была Марына Аляксандраўна Болтрык. У хіміка-біялагічным класе здолелі паступіць 88% вучняў, а ў гістарычным - 85%. Трэба дадаць, што ўлічваліся толькі асобы, якія сталі студэнтамі ВНУ. Дарэчы, не толькі беларускіх. Некалькі чалавек ад'ехалі на вучобу ў Польшчу і Расію. Амаль усе астатнія будуць вучыцца ў сярэдніх навучальных установах.

"Я паступіла дзякуючы ліцэю", - сказала вучаніца педагагічнага класа. Напэўна, гэтыя словы можа паўтарыць амаль кожны былы ліцэіст.

Дарэчы, у гэтым годзе сюды прыйшлі працаваць новыя настаўнікі-спецыялісты па гісторыі, фізіцы, матэматыцы, замежнай мове і фізкультуры.

Сёлета каля 250 асобаў прыйшлі ў 10-я класы ліцэя. Яны сталі навучэнцамі эканамічнага, філалагічнага, хіміка-біялагічнага, мастацкага, педагагічнага, беларускага гуманітаранага і гістарычнага профіляў. Дарэчы, цяпер у ліцэі адчыніліся два новых класа: політэхнічны і хіміка-біялагічны абласны. У апошнім вучыцца моладзь з раёнаў. Падчас навучальнага году яны жывуць у інтэрнаце, які забяспечылі аблана і сельгасінстытут, а таксама бясплатна харчуюцца.

Для новага політэхнічнага профілю ў Гродзенскім Універсітэце распрацавана праграма навучання. Падчас спецкурсаў ліцэісты будуць працаваць ва ўніверсітэцкай лабараторыі. Да слова, ужо не першы год спецкурсы ў ліцэі выкладаюць настаўнікі ГрДзУ.

Плануецца таксама ўсталяванне лакальнай камп'ютэрнай сеткі. Некалі настаўніца інфарматыкі жартавала, што з дапамогай такой сеткі мы зможам на кантрольнай пасляць суседу ў камп'ютэр паведамленне з просьбай дапамагчы вырашыць задачу, і аб гэтым ніхто не даведаецца. А неўзабаве гэта павінна здзейсніцца.

У ліцэі ёсць таксама новы кабінет для заняткаў па экалогіі. Туды вельмі любяць хадзіць на экскурсію ліцэісты, бо ў ім жывуць два папугаі, а інтэр'ер створаны паводле спецыяльнага праекту.

Акрамя гэтага, ствараецца трэнажорная зала. Туды ўжо закупілі сучаснае абсталяванне фірмы KETLER. Трэба чакаць, што хутка фізкультура стане улюбёным прадметам ліцэістаў.

Хутка ў ліцэі будзе дзейнічаць фотагуртак. Туды могуць запісацца ўсе жадаючыя. Заняткі будзе праводзіць член фотаклуба "ГРОДНА", былы карэспандэнт "Гродзенской праўды" У.П.Выдэрка.

Так што з кожным годам ліцэй робіцца ўсё больш прывабным для моладзі. Трэнажорны зал, камп'ютэрны клас, прыемная дэмакратычная атмасфера і выдатныя настаўнікі. Што яшчэ трэба ліцэістам?..

Інга АСТРАЎЦОВА.

П О Л Ь Ш Ч А

Хто сказаў, што летам не вучацца?

16-28 жніўня ў Варшаве праходзілі камп'ютарныя курсы для выдаўцоў газет, часопісаў і кнігаў. Арганізатарамі летніх варштатаў стаў Польска-Чэска-Славацкі фонд.

Маладыя людзі з Гродна (школа Маладога журналіста) і Мінску (часопіс "Беларускі гістарычны агляд") прыехалі, каб набыць новыя і ўдасканаліць старыя веды. Тэарэтычныя і практычныя заняткі па вёрстцы далі ім магчымасць авалодаць новай спецыяльнасцю - тэхнічны рэдактар. Да ўсяго нашы хлопцы і дзяўчаты наведалі Сейм, музеі, архіў, пабывалі ў гасцях у беларускай рэдакцыі Польскага радыё і не забылі пра адпачынак у Каралеўскім парку.

Курсы атрымаліся. Як кажуць - спалучылі прыемнае з карысным.

АСЯ ВЕРБА.

Польскі ліцэй вітае вучняў

Унядзелю ў актавай зале Гродзенскага музпедвучылішча адбылася інаўгурацыя навучальнага году ліцэя "Польскай Мацежы Школьнай". Імпрэза была прысвечана таксама 200-м угодкам са дня нараджэння Адама Міцкевіча.

Выпускнікі ліцэя паказалі сцэнку з вершамі і спевамі пра жыццё вялікага паэта. Многія з іх ужо сталі лаўрэатамі творчых конкурсаў, якія праходзілі ў Польшчы.

Ліцэй існуе ўжо некалькі гадоў. Заняткі праходзяць у вольны ад школы час. Настаўнікі з Кракава выкладаюць тут польскую мову, культуру і гісторыю Польшчы. Плануюць таксама стварыць тэатр паэзіі, куды запрашаюць усіх вучняў, хто добра спявае, грае на якім-небудзь музычным інструменце або піша вершы. А самі ліцэісты збіраюцца выдаваць на польскай мове маладзёвую газету "ЭКСПРЭС". Першы пробны нумар ужо выйшаў.

Зараз у ліцэі навучаюцца дзеці 5-11-х класаў. Кожная з 9 груп склада-ецца прыблізна з 20 чалавек. Ёсць таксама і групы для дарослых. Першая - для асоб, якія толькі пачынаюць вывучаць польскую мову, другая для тых, хто ўжо дастаткова добра валодае ёй.

Між іншым, каля 20 выпускнікоў ліцэя паехалі вучыцца ў Польшчу. Яны сталі студэнтамі польскіх ВНУ, дарэчы, не толькі гуманітарных.

Інга АСТРАЎЦОВА

А Ш М Я Н Ы

Дэпутату забаранілі паказваць "Канфлікт з пасламі"

Дэпутат Ашмянскага райсавета Пётр Явідовіч у вольны час любіць маляваць. Натуральна, як і любы мастак хоча, каб яго творы змаглі пабачыць як мага больш людзей. Свае апошнія працы абстрактнага характару, сярод якіх "Канфлікт з пасламі", "Паядынак" і два калажы на якіх выяўлены канфлікт улады з прэсай, наіўны мастак хацеў выставіць у фае дома Саветаў альбо ў чытальнай зале раённай бібліятэкі. Аднак не тут тое было. Адразу стварылі камісію з кампетэнтных людзей і вынеслі рашэнне, што праводзіць такую выставу немэтазгодна. Цяпер многія знаёмыя і шмат хто з цікаўных наведваюць бедалагу мастака ў яго хаце з тым каб насамрэч пабачыць шэдэўры.

А.СВІРЧУКОЎ

Л І Д А

Адкрыўся яшчэ адзін храм

Умінулую нядзелю ў вёсцы Радзівонішкі Лідскага раёна асвяцілі мясцовы храм. Гэта свята адбылося дзякуючы самім вернікам. Два гады назад па ініцыятыве В. Рыпецкай і А.Бубейка жыхары навакольных вёсак пачалі збіраць грошы на аднаўленне даўно закінутай праваслаўнай царквы. Сродкамі дапамог і райвыканкам.

У рамках праекта "Бізон"

Горад Ліда сумесна з нямецкім горадам Грюнесмюленд пачаў сумеснае супрацоўніцтва ў рамках праграмы TASSI з выхадам на Еўрасаюз.

Абодва бакі працуюць над ажыццяўленнем трохгадовага праекта "Бізон", які распрацавала міжнароднае юрыдычнае бюро. Напачатку бягучага года дэлегацыя лідчан у склад якой уваходзілі прадстаўнікі гарвыканкама працяглы час знаходзілася ў Германіі. Там яны знаёміліся і бралі на заметку вопыт работы нямецкіх калегаў. Цяпер у рамках існуючага праекта Ліду наведала дэлегацыя Еўрасаюза з мэтай дапамагчы лідчанам пачаць перабудову ў тых напрамках, якія акрэслены згодна з праграмай. Дэлегацыя ўжо пазнаёмілася з работай службы "Цеплассетак" і водаканала.

Ёсць спадзяванне, што ў Лідзе сапраўды нешта зменіцца.

У гонар А.Міцкевіча

Таварыства польскай культуры Лідчыны аб'явіла конкурс для паэтаў Ліды на лепшы пераклад некалькіх твораў знакамітага паэта А.Міцкевіча на беларускую мову. Лепшыя з іх будуць надрукаваны на старонках газеты "Ziemia Lidska", а таксама плануецца іх выдаць асобным зборнікам. Дарэчы, лідскі паэт Іосіф Майся нядаўна пераклаў на беларускую мову і надрукаваў у "Лідскай газеце" вядомую баладу "Свіцязянка". Так што традыцыя як бы ўжо закладзена.

Т.ЧАРНАВУС

С м а р г о н ь

Торговля всегда выручала

Коллектив комбикормового завода из Сморгони активно занялся организацией торговли. Причем, не только в городе, но и на селе. На территории района у него насчитывается сем собственных магазинов, ежедневно отправляет в отдаленные деревни Кревского сельского Совета автомагазин с товарами первой необходимости. Ежемесячный торговый оборот уже превышает четыре миллиарда рублей. Недавно администрация ОАО Сморгонский комбикормовый завод купила у колхоза "Дружба народов" свиноферму, которая приходила в запустение. Планируется на кормах собственного изготовления содержать 1600 голов свиней и поставлять продукцию в свои торговые точки и магазины города. Здесь же, в деревне Медрики, скоро откроется заводской фирменный магазин, восьмой по счету. Уже закуплена и смонтирована линия по производству колбас. Пока ежедневно в магазины города поставляется только тонна колбас, в том числе до ста килограммов "Крестьянской", которая раскупается в считанные минуты.

Такая деятельность позволяет предприятию иметь на счету оборотные средства и направлять их на нужды коллектива - так считает директор завода Михаил Чукович.

П.МАКЛЮК

Студенты уехали копать картошку

На этой неделе гродненское студенчество отправилось по колхозам и совхозам области со знакомой миссией - помочь в уборке второго хлеба. В этом году поступило заявок более чем на шесть тысяч человек. Правда, студентам пообещали, что более месяца их на картошке не продержат. Но что будет на самом деле пока неизвестно.

(Соб. инф.)

Вечная памяць

Дня 2 верасьня Бог паклікаў да сябе протапрасвітара Яна Матусевіча, дэкана Беларускай грэка-каталіцкай царквы. Айцец Ян адыйшоў пражыўшы 50 гадоў пасьля амаль 25 гадоў сьвятарскага служэньня. Ягонае жыцьцё заўжды было верным і руплівым служэньнем Богу і Бацькаўшчыне. Апошнія восем гадоў гэтую службу ён выконваў у Беларускай грэка-каталіцкай царкве. Айцец Ян быў глыбока ўпэўнены, што адзіны шлях да адраджэньня Беларусі ідзе праз адраджэньне духоўнае. Таму пры слабым здароўі ён не ашчаджаў сваіх сілаў, каб несьці духоўную падтрымку і мудрую раду ўсім, хто шукае Праўды і хто хоча верна служыць Радзіме. Пра гэта сьведчыць ягоны ўдзел у шматлікіх грамадзкіх і культурных арганізацыях. Адыход айца Яна Матусевіча напаўняе нас глыбокім смуткам, але, як хрысьціяне, мы, перш за ўсё, хочам выразіць удзячнасьць Госпаду за ўсё дабро, якое айцец Ян зрабіў у сваім жыцьці для Царквы Хрыстовай, дзеля збаўленьня людзей і дзеля духоўнага адраджэньня Беларусі.

Хай Госпад Царквы, Ісус Хрыстос, дасьць вечны супакой слузе свайму протапрасьвітару Яну і ўчыніць яму вечную памяць.

Апостальскі візітатар для грэка-католікаў Беларусі, архімандрыт **Сяргей (Гаек)**

Предприниматели всех сфер, объединяйтесь!

"Скоро мы все станем уголовниками", или

Семь вопросов к ГНИ

После предыдущего выхода "БИ" (N 28 от 3 сентября) и публикации о профсоюзном собрании предпринимателей рынка "Южный" в редакции были рассказаны две кратенькие истории. Вот они.

История первая

"Я на рынке новичок. Торгую с июня. Вашу газету читаю постоянно. Сейчас возникла острая необходимость поделиться с кем-то своими проб-лемами. Почему не с газетой?

Предпринимателем я стала, можно сказать, случайно, как и многие на рынке. По специальности я воспитатель, люблю детей. Хотелось организовать нечто вроде детского сада на дому, как это делается за границей, для пяти-шести ребятишек, но когда подсчитала все расходы, стало ясно, что родителям это не по карману. Рынок - далеко не сахар. Я вдруг оказалась "по другую сторону барьера". Пока была покупателем, воспринимала продавца как человека, стремящегося нажиться. Теперь понимаю, что он стремится выжить, как и все вокруг. С одной лишь разницей - за свой собственный счет. Но судя по государственной политике в отношении предпринимательства, это кому-то не нравится. Иначе откуда взяться такой безобразной схеме, когда мелкий бизнес не поощряется, а душится всеми возможными и невозможными способами.

Кстати, моя чистая прибыль составляет около 50 у.е., как принято говорить.

Но за эти у.е. приходится работать под открытым небом шесть дней в неделю.

А для чего и кто изобрел совершенно несуразную систему отрывных талонов и "технологию" их заполнения? Кто из предпринимателей имеет возможность купить валюту свободно в обменном пункте по чеку? Почему налоговый инспектор считает, что его работа - штрафовать? Все это можно расценить однозначно -против предпринимателя настроено его собственное правительство. И когда мне говорят - "Только не о политике!" - дико становится. А о чем же еще? Мы все дошли до момента, когда об экономике говорить бесполезно - ее никто не строит, а зачатки рынка интенсивно искореняются. Это именно политика...

Впрочем, справедливости ради надо сказать, что и сами предприниматели на рынке - жлобы. Сидят на своих пятачках, и дальше одного квадратного метра ничего не хотят видеть. Какие уж тут перемены?"

История вторая

"28 августа я приехала на рынок в 8.45, должна была передать маме 22 блузки, привезенные вечером из Польши. С мамой мы разминулись, так получилось. Она записала блузки в журнал и ждала меня, не торгуя. Ее блузки остались у меня в палатке, я готовилась к торговле, развешивала товар, но не торговала...

В это время подошли инспекторы, стали считать товар по журналу (хотя я и сказала, что не торгую; весь товар был записан верно, кроме этих 22 блузок).

В это время подошла мама, чтобы забрать их. Однако инспектор не отдал, сказал, что они конфискованы. Мама просила - проверьте документы, но ее даже слушать не стали, сказали, что ко мне за этими несчастными блузками может подойти кто угодно, любой человек. Даже любовник. Потом залезли в мою сумку, достали кошелек с деньгами, проверили все отделения, положили к себе в карман. Сказали при этом, что деньги должны быть записаны в журнал, а раз нет - значит, они конфисковываются. После этого поставили условие - или блузки забирают или кошелек. В конце концов сделали "снисхождение", кошелек вернули, а акт составили „всего" на девять блузок (по 1200000 каждая), как на незарегистрированный товар. А ведь он был записан у мамы! И это можно было проверить. Однако забрали не девять блузок, а все 22, понесли в кладовую. Сказали, что 10800000, которые я заплачу, сразу пойдут в бюджет.

В налоговой сразу же потребовали внести эту сумму. В течение часа. Я попросила отсрочить, сказала, что заплачу в течение десяти дней. В ответ - угрозы, оскорбления, даже жалобы... Да, жалобы! Мол, он потратил на меня три часа, его будет ругать начальник, он мало людей оштрафовал, не смог заработать себе премию. Объяснил, что наши проблемы - это не к нему, а к правительству.

Тыкал мне в лицо декреты. Впрочем, я не думаю, что эти декреты позволяют ему рыться в моих личных вещах, и копаться в кошельке. Хотя, кто знает...

Закончилось все тем, что мы с мамой бегали по рынку и одалживали десять миллионов... Более того, поскольку это - мой второй штраф, дело передано в налоговую полицию. Нас постепенно превращают в каких-то уголовников. Мало денег в бюджете? Но не в карман же, простите, лезть. И другое обидно - попросила знакомую из соседней палатки, которая все видела, выступить свидетелем. Что вы! Она ничего не заметила и нигде подписываться не станет. Ну, какой риск, скажите, засвидетельствовать правду? Нет, боятся."

Комментарий „БИ"

Обе наши гостьи ничем не напоминали этаких "buziness-woman". Милые дамы -первая постарше, вторая помоложе. Одна со Скидельского рынка, вторая - с "Южного". Товар разный. Но независимо от места торговли, возраста и товара (хоть по всей Беларуси прокатись!) предприниматели действительно постепенно усилиями все того же государства превращаются в уголовников.

Хорошо. всех лишим имущества, пересажаем, а дальше что? К кому приставят армию налоговиков? Может, к бомжам? А что, это идея. С каждой подобранной бутылки - налог с нарастающим итогом за год, за сокрытие стеклотары - штраф, за повторное - в каталажку.

Кстати, для несведущих: фиксированная ставка налога на рынке составляет пять минималок в месяц - 1250000. Но это не все. Плата за место - 160000 ежедневно за две недели вперед. Ходишь ты на работу, не ходишь - а заплати.

У нас государство вообще любит брать предоплату, инфляция, знаете ли. Зато в любимой нашим президентом Германии во время экономического кризиса зарплату платили дважды в день, чтобы люди успевали "отоварить" стремительно дешевеющие деньги хотя бы на продукты. Итак, более шести миллионов нужно заплатить за возможность торговать. Люди готовы платить больше в обмен на нормальные взаимоотношения с фискальными службами, с милицией и в целом с государством. Готовы. Но, вероятно, даже вдвое увеличенный налог - это намного меньше, чем штрафные санкции. Поэтому, я думаю, ситуация будет усугубляться.

Теперь конкретные вопросы, которые редакция "БИ" вместе с этой публикацией вышлет в ГНИ РБ.

1. Имеет ли право налоговый инспектор на личный досмотр (обыск) торгующего, в частности - одежды, в которую торгующий одет, досмотр (обыск) кошелька без разрешения соответствующих инстанций, в частности, санкции прокурора?

2. Имеет ли право торгующий наряду с деньгами, полученными от выручки за товар и зафиксированными в журнале, иметь при себе личные деньги и в каком колличестве?

3. Существуют ли при налоговых инспекциях планы по сбору штрафов, и если существуют, то кто "доводит" до местных налоговых органов эти планы?

4. Какова заработная плата налоговых инспекторов, старших налоговых инспекторов, начальников налоговых инспекций? Существует ли в налоговой службе система денежных поощрений (премий) и за какие показатели?

5. Обязан ли налоговый инспектор знакомить налогоплательщика (в частности, предпринимателя) со всеми изменениями в налоговом законодательстве?

6. Должен ли налоговый инспектор, по требованию предпринимателя, предъявить документ, на основании которого он производит свои действия?

7. Какова численность работников налоговой инспекции РБ?

Вопросы несложные, надеюсь, чтогосударственных тайн не затрагивают. Поэтому в течение десяти дней с момента подачи запроса редакцией (по Закону о печати)соответствующие официальные лица должны четко и внятно ответить. Мы непременно опубликуем в "БИ" этот ответ, и, может быть, кому-то из предпринимателей станет понятнее, как вести себя в тех или иных ситуациях. Более того, вы можете все свои вопросы адресовать в профсоюз (тел. 72-00-72) или непосредственно к нам (письменно, или устно - неважно). Мы их немедленно переадресуем в ГНИ, в ОБЭП, в прокуратуру. То есть, в любую официальную инстанцию. Кроме, пожалуй, Администрации президента. Хотя...

Елена РАВБЕЦКАЯ

Заложники в Доме связи

Окончание. Начало на стр.1

Короче он сказал, что за ним охотится американская разведка, что они его хотят убить, что его жена в Америке завербована, он очень много знает сведений, половину КГБ уже передал, половину еще осталось передать. Это весь его разговор.

- Как все закончилось?

- Нашли они этого кэгэбэшника, и он сразу сам сдался: открыл дверь, руки на стену и сказал "я пошутил, у меня ничего нет".

- Какое у вас о нем впечатление?

- Такое чувство, что он какой-то ненормальный.

Следствие по этому делу проводит Ленинский РОВД. Экспертная оценка психического состояния преступника еще не проводилась, но все знакомые с этим делом склоняются к тому, что он - больной человек. На наш вопрос о защищенности граждан от посягательств неуравновешенных, а, порой, больных людей, представитель психдиспансера ответил:

"У нас на диспансерном учете стоят около 6000 человек. Только 50 из них находятся на стационарном лечении. Остальные удерживаются в обществе, некоторые на квалифицированных работах."

Ирина ЧЕРНЯВКА

Допускаются все, кому за 16...



Вначале месяца состоялась рабочая встреча исполнительного директор Белорусской Ассоциации молодых политиков Александра Цынкевича и председателя Гродненской региональной организации Объединенной гражданской партии Валерия Левоневского. Достигнута договоренность о создании Ассоциации молодых политиков в Гродненском регионе. Координационный центр по созданию Ассоциации находится по адресу Гродно, Ст.Батория 8-201. тел. 72-00-72.Желающие попробовать свои силы в политике, старше 16 лет, могут обращаться с 18.00 до 19.00 по указанному адресу.

На фото: А.Цынкевич (слева) и В.Левоневский.

Только факты

У них, в Великобритании. У нас, в Беларуси

<u>У них</u>: отсутствует система регистрации общественных и политических организаций. Несколько человек могут организовать свою партию без ограничений и согласований. Создание каких-либо препятствий (финансовых, регистрационных, количественных) в создании общественных организаций считается преступлением. Достаточно 10 человек для выдвижения кандидата на выборах на любой уровень власти. Бюджет является открытым и прозрачным для граждан.

<u>У нас:</u> для создания партии необходимо 500 человек и длительная процедура регистрации, партия может быть прикрыта



в любой момент.

Тысячи подписей надо собрать кандидату в депутаты РБ.

Бюджет страны не является доступным для граждан, по результатам их голосования на референдуме 1996 года.

Страчаная спадчына

Вуліца Карла Маркса

Сфарміравалася не пазней XУ ст. уздоўж трасы Смаленскага тракта. У XУI ст. Гістарычныя назвы - Азёрская, Брыгіцкая, затым надоўга - Скідальская і Кутузаўская, Купецкая. У канцы вуліцы ў XУI ст. згодна з дадзенымі выдатнага беларускага гісторыка, прафесара, на жаль, ужо нябожчыка, Міхася Ткачова, знаходзілася Смаленская брама (пазней Брыгіцкая) Гродзенскага магістрата. Пры жыцці М.Ткачова не ўдалося дакладна высветліць, дзе канкрэтна стаяла гэта брама і ўжо толькі цяпер нам вядома, што яна мясцілася ў XУ-XУIII ст. перад "сярэднім" мастом праз чыгунку. Хто ведае, магчыма астаткі брамы і дагэтуль захаваліся і іх калі-небудзь абавязкова адшукаюць археолагі.

У XУI ст. вуліца забудоўвалася ад гарадскога Рынка (месца Савецкай плошчы) у асноўным дамамі рамеснікаў і рэзыдэнцыямі магнатаў. Прычым, у 1567 годзе перад Смаленскай брамай знаходзілася "Крывая карчма" (пазней належала манахіням-брыгіткам), а за ёй, па-за межамі горада - гарадская віселіца. Яе вельмі рэалістычна адлюстраваў на сваім малюнку Адэльгаўзэр. У XУII-XУIII ст. на вуліцы былі пабудаваны такія важныя аб'екты, як комплекс Брыгіцкага кляштара, частка Іезуіцкага калегіўма ("Старая Бурса" і гаспадарчыя пабудовы), палац Бжастоўскіх (пазней палац Сапегаў, больш вядомы гродзенцам, як "Батароўка") "Izba Seimowa" альбо Sala Poselska Sejmowa". Нагадаю, што да пабудовы Новага Замка, для правядзення сеймаў быў прыстасаваны



Пачатак вуіцы Купецкай (К.Маркса) у 1906г. На здымку добра відаць першыя ў Гродне электрычныя слупы.

палац Сапегаў у якім жыў кароль з сям'ёй і прыслугай. Ён хадзіў з сваёй спальні на другі паверх на сумесныя паседжанні сенатарскай і пасольскай палатаў у Іезуіцкім касцёле. Для гэтага быў збудаваны спецыяльны крыты пераход праз вуліцу. А для правядзення паседжанняў пасольскай палаты вышэй па вуліцы быў збудаваны спецыяльны будынак, аўтарам праекта якога, на думку спецыялістаў, быў сам Сапега. Па дадзеных, якія ёсць у нас, можна меркаваць, што "Izba Sejmowa" мясцілася прыкладна там, дзе зараз дамы №№ 5,7,9,9а.

Асноўная гістарычная забудова вуліцы, якая захавалася да нашых дзён, адносіцца ў асноўным да канца XIX - пачатку XX стагоддзя. На вуліцы жыла Эліза Ажэшка, Станіслаў Касцялкоўскі, Зоська Верас. Калі прозвішчы Ажэшкі і Верас добра вядомы чытачам "БИ", то пра Станіслава Касцялкоўскага варта распавядаць больш падрабязна. Ён паходзіў з вядомай шляхецкай сям'і на Гродзеншчыне. Пачынаў сваю кар'еру гісторыка (яшчэ да ўніверсітэта вывучаў гісторыю ў Гродне ў самога Я.Арлоўскага) да Першай сусветнай вайны артыкулам аб дзейнасці А.Тызэнгаўза і, дарэчы, да сканчэння свайго жыцця так ніколі і не змяніў гэтай тэмы. У семідзесятыя гады ў Лондане выйшла найбольш поўная манаграфія аб дзейнасці Антонія Тызэнгаўза. Дакументы, на якія абапіраўся С.Касцялкоўскі зніклі падчас вайны, а манаграфія налічвае больш за дзьве тысячы старонак. Касцялкоўскі, як даследчык гісторыі Гродна, здзейсніў сапраўдны подзвіг. На жаль, толькі, што і дагэтуль ён нікім не ацэнены.Праўда, аматары гродзенскай мінуўшчыны могуць азнаёміцца з жыццём гэтага выдатнага чалавека і гісторыка ў аддзеле рэдкай кнігі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. На маю думку, гэту кнігу трэба абавязкова перавыдаць (яна, дарэчы, на польскай мове) з каментарамі сучасных спецыялістаў.

Карла Маркса 1. "Дом Баторыя", "Батароўка" - па дадзеных гродзенскага БТІ знаходзіцца па іншаму адрасу і нягледзячы на тое, што мы ўжо пісалі пра гэты аб'ект, да яго мы яшчэ вернемся ў спецыяльнай публікацыі.

Карла Маркса 5. Год забудовы - 1870. Згодна з папярэднімі дадзенымі, напэўна, тут жыў Станіслаў Касцялкоўскі.

Карла Маркса 7. Год забудовы - 1870. Магчыма ў гэтым будынку на ўзроўні першага паверху і піўніцаў знаходзіцца больш стары будынак. Эклектыка.

Карла Маркса 9. Год забудовы - 1904. У стылі эклектыкі.

Карла Маркса 11. Год забудовы - 1861. Дата прыведзена паводле дадзеных Гродзенскага БТІ. Безумоўна гэта цікавы аб'ект, але аўтару, на жаль, так дагэтуль і не ўдалося сур'ёзна ім заняцца.

Карла Маркса 13. Год забудовы - 1889. "Пасляпажарная" эклектыка.

Карла Маркса 15. Год забудовы - 1885. Эклектыка, страчаны шэраг цікавых архітэктурных дэталяў.

Карла Маркса 19. Год забудовы - 1890. Таксама страчаны дэталі, зрэшты захавалася фотафіксацыя 1988 года.

Карла Маркса 21. Год забудовы - 1900. Пасля капрамонта з'явілася цікаўная сталярка...

Карла Маркса 23. Год забудовы - 1909. Эклектыка.

Карла Маркса 25/1. Год забудовы - 1909. У гэтым будынку некалі знаходзіўся кабінет аўтара і ягоных калегаў па рэстаўрацыі. Пасля таго, як пажар 1885 года знішчыў папярэднія будынкі, на гэтым мейсцы пляц забудоўваўся намаганнямі Шалома.

Карла Маркса 27. Комплекс брыгіцкага жаночага кляштара. Пабудаваны ў 1642-1651 гадах. Помнік архітэктуры рэспубліканскага значэння. Аб гродзенскіх каталіцкіх, вуніяцкіх і праваслаўных кляштарах мы плануем надрукаваць асобныя матэрыялы. А пакуль толькі зазначым, што такія вядомыя асобы 70-ых гадоў, як Коля Вагнер і Лютак, правялі ў быдынку кляштара пэўны час свайго жыцця. Дарэчы, Лютак у свой час ахвяраваў у Фонд Міру ўсе зарobленыя цяжкай працай грошы. Былыя келы - . цяпер бальнічныя палаты - намаляваў бадай самы таленавіты мастак гродзенскага underground'а 70-ых гадоў, Саша Х. У яго адбылася толькі адна выстава і тое ўжо пасля смерці.

Карла Маркса 2. Частка комплекса іезуіцкага калегіўма - "Будынак старой бурсы". Пабудаваны напрыканцы XУII ст., дабудаваны ў 1880 і 1920 г.г. Праект рэстаўрацыі - архітэктара В.Барсукова (1991г.)

Карла Маркса 4. Частка комплекса іезуіцкага калегіўма - гаспадарчыя і службовыя памяшканні. Пабудаваны ў XУIII ст., рэканструяваны ў 1880 годзе. Праект рэстаўрацыі архітэктара В.Барсукова. Абодва гэтыя будынкі належалі комплексу гродзенскага калегіўма іезуітаў, праўда, былі адарваны ад комплекса, так як і будынак цяперашняй вязніцы, у XIX ст. Праект рэстаўрацыі здзяйсняўся адным з начальнікаў ад рэстаўрацыі спецыяльна " пад старшыню калгаса А.Дубко". Але хоць з таго часу мінула ўжо некалькі гадоў, работы дагэтуль не скончаны, як, дарэчы, і яшчэ на адным будынку, які належыць "Прагрэсу". Работы ўсё ж тут павінны будуць калі-небудзь скончыць, нягледзячы нае тое каму б гэты будынак у будучым не належаў. Справа ў тым, што гэта вельмі каштоўны комплекс забудовы Гродна. Дарэчы, адносна правоў на гэтыя забудовы. У XIX ст. і ў 20-ыя гады нашага стагоддзя вяліся судовыя валакіты паміж праваслаўным і каталіцкім прыходамі.

Карла Маркса 6. Год забудовы - 1873. Перабудаваны пасля пажару 1885 года. У стылі эклектыкі, яшчэ не зусім страчаны каштоўныя архітэктурныя дэталі.

Карла Маркса 8. Пабудаваны ў другой палове XIX ст. У стылі эклектыкі.

Карла Маркса 10. Пабудаваны ў другой палове XIX ст. Аўтар нядаўна працаваў над гэтым аб'ектам, але яго гісторыя не зацікавіць чытача.

Карла Маркса 12. Год забудовы 1890, 1900. У стылі эклектыкі, страчаны шмат якія архітэктурныя дэталі.

Карла Маркса 14. Год забудовы - 1898. У стылі эклектыкі.

Карла Маркса 16. Год забудовы - 1878. Гэты даволі цікавы будынак, на жаль, вельмі мала намі даследаваны.

Карла Маркса 16а. Год забудовы - 1875, 1888. Меў даволі дзіўны флігель.

Карла Маркса 18. Год забудовы - 1888. У стылі эклектыкі.

Карла Маркса 22. Год забудовы - 1870. "Дапажарны" дом, неаднаразова перабудоўваўся.

Карла Маркса 24. Год забудовы - 1889. Гэта дата выклікае ў нас сумненне.

Карла Маркса 30. Год забудовы - 1886, капрамонт праведзены ў 1976. Страчаны шэраг архітэктурных дэталяў.

Карла Маркса 32. Пабудаваны напрыканцы XIX ст. У стылі эклектыкі.

Карла Маркса 34. Пабудаваны ў 1880 годзе. Дата забудовы прыведзена згодна з дадзенымі Гродзенскага БТІ. Мы ж лічым, што дом быў пабудаваны некалькі раней.

Карла Маркса 34а. Пабудаваны ў 1860 годзе.

Карла Маркса 36. Пабудаваны ў 1900 годзе. Эклектыка.

Карла Маркса 38. Пабудаваны напачатку XX ст. Эклектыка.



Рынак у 1883 годзе паміж Фарным (іезуіцкім) касцелам і "Батороўкай" -пачатак вуліцы Кузнецкай (зараз Карла Маркса).

Карла Маркса 38а. Пабудаваны ў 1900 годзе. Эклектыка.

Карла Маркса 40. Год забудовы - 1870.

Карла Маркса 40а. Год забудовы - 1870.

Карла Маркса 40/1. Год забудовы - 1932.

Карла Маркса 42. Год забудовы - 1888.

Ігар ТРУСАЎ, гісторык архітэктуры.

Здымкі выкарыстаны з уласнага архіва І.ТРУСАВА.

м у з е й

Максім Багдановіч



Лепшыя гады класіка сусветнай літаратуры Максіма Багдановіча прайшлі ў Гродна сто гадоў назад. У Доме Паэта цяпер змешчаны яго Музей. Там прадстаўлены кнігі і людзі Эпохі Багдановіча, там існуе даўняе Гродна, якога нідзе больш няма...

"Праўдзівая краса прамаўляе да душы і сэрца кожнага, хто здолен яе адчуваць, незалежна ад таго, які народ творыць яе. Нацыянальнае стаецца адкрыталюдзкім праз укрытую ў ім чыстую красу. Багдановіч, як пясняр чыстае красы, выбірае для свае творчасці беларускія элементы не затым, што яны блізкія яму, а затым, што ў іх ёсць сапраўднае хараство. І ў гэтым вялікая заслуга яго, бо такім чынам найлепшыя творы беларускай нацыянальнай душы ўзнімаюцца на тую ступень, на якой стаяць такія ж творы іншых народаў. Выкрываючы вечную, няўмiручую красу ў нашым родным, беларускім, Багдановіч уводзіць нас у сямейства культурных народаў з большай пэўнасцю, чым тыя, хто піша "вялікія трактаты" аб нашым праве на гэта..."

Гэтак сказана пра Паэта яшчэ ў 1927 годзе і з той пары гэтыя словы справядлівыя.

Музей Максіма Багдановіча ў Гродна знаходзіцца па адрасу: 230023 Гродна, вул. 1-га Мая, 10. Тэл. 72-22-54. Працуе з 10.00 да 18.00. Выхадныя дні - нядзеля і панядзелак. Студэнтам і школьнікам экскурсіі ў зручны час можна замовіць па тэлефоне. Музей прапануе літаратуру ўласнага выдання (гандлёвая сетка не распаўсюджвае) пра Паэта, яго музей і яго ўласныя творы.


Інфармацыя змешчана ў сувязі з новым навучальным годам пры



В порядке обсуждения

Деготь в мед, который могли бы черпать вместе

Слабость белорусской оппозиции, расплывчатость национальной идеи известны всему миру. Бог свидетель, мир старается помочь здоровым белорусским силам. Не будем далеко ходить, возьмем ближайшего соседа, исторически наиболее давно связанного с Беларусью - Литву: уже и не счесть, сколько за последние годы в Вильнюсе прошло съездов и конференций белорусской оппозиции!



На снимке: литовский праздник святого Линаса в Пелясе Вороновского района. Поют по-литовски - а как им еще петь?

Однако, что мы видим в ответ?

"Биржа информации" целой полосой (N 21 от 16 июля) откликнулась на празднование 745-й годовщины коронации Миндауга. Кстати, именно Миндауга, а не "Миндовга", как пишет "БИ", потому что так говорят и пишут и белорусы и литовцы. Совершенно справедливо погоревав, что белорусы равнодушно не обратили внимания на славную годовщину, "БИ" тут же выдала несколько удивительных пассажей. К примеру:

"... мы можем стоять в стороне, когда на нашей богатой традициями земле, соседи празднуют наши (пусть исторически общие) праздники, игнорируя нас самих, наш язык."

Выходит, в Кревском замке высадился чуть ли не некий десант, который (не с провокационной ли ..лью?) отпраздновал "наш" праздник?

На самом деле праздник устроило Гродненское областное объединение литовцев "Тевине", 99 процентов которого составляют граждане Беларуси! Понимаете? Не "соседи" праздновали, а люди, предки которых жили на этой земле, и потомки жить будут. Гости из Литвы, как заметила сама "БИ", были только гостями, а не устроителями и хозяевами праздника.

"В Крево в тот июльский вечер я не был - список гостей был весьма определенным", - пишет в том же номере историк Игорь Трусов. "Список гостей" определялся не какими-то коварными соображениями, как можно понять из намека историка, а количеством мест в автобусе. Чуть ли не за год до праздника "Тевине", сняв шапку и протянув руку, начала собирать деньги. Где - лит, где - ..бль... Потом арендовали автобус, сели и поехали в Крево. Что мешало то же самое сделать белорусам? В одном только Гродно насчитывается несколько дюжин организаций, объединений, партий, газет, называющих себя демократическими, патриотическими, сознательными... Где они были? Почему белорусский историк на своем празднике желает быть только гостем?

Не понравился "БИ" и актер, который "зачитал длинную грамоту на литовском языке, нисколько не заботясь о том, как она звучала в оригинале сотни лет назад. Ведь всем известно, что государственным языком в ВКЛ был старобелорусский, и все грамоты зачитывались именно на нем".

Все5м, конечно, известно (кроме, очевидно, автора статьи Валентины Вешторт), что при дворе великих князей литовских писали грамоты не на "тарашкевице" или "совнаркомовке", не на "старобелорусском", а пользовались, как бы поточнее сказать, белорусской редакцией церковнославянского языка, который народные массы не понимали тогда, не понимают и сейчас. Заговори актер на том языке - кто бы его понял? Следуя логике автора, литовцы должны были тексты своих фольклорных песен переложить на белорусский, дабы "не игнорировать" белорусов - так, что ли? Литовцы этого не сделали, значит, они "непомнящие иваны", делает вывод "БИ"/ Нам ложиться спать или вставать? Белорусы забыли праздник - плохо; литовцы отметили - тоже плохо...

Еще раз "БИ" вспомнила день коронации Миндауга в N 25 от 13 августа, поместив статью под названием "Сокровища Литовской империи". Империи? Помилуйте, Литва никогда не была империей, и близко империю никогда не напоминала. Это то же самое, что назвать Беларусь "рэйхом". Что за грязный намек такой? В данной статье речь идет о кладе, найденном в Вильнюсском архикафедральном соборе, то есть, речь идет о сокровищах католического костела. Костел и государство - отнюдь не одно и то же. Хлесткое (и неграмотное) название статьи перечеркнуло смысл и придало двусмысленный оттенок материалу. Зачем, за что?

